1. *Стернин, И. А.* Коммуникативное поведение в структуре национальной культуры [Электронный ресурс] / И. А. Стернин. – Режим доступа: http://www.iling-ran.ru/library/psylingva/sborniki/Book1996/Part2–2.htm. – Дата доступа: 02.05.2018.

2. *Уорд, Колин.* Азбука аккультурации / Колин Уорд // Психология и культура / под ред. Д. Мацумото. – СПб., 2003. – Гл. 20. – С. 656–696.

***В. І. Саітава,***
*кандыдат педагагічных навук, дацэнт,*
*прафесар кафедры бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

# ПРАМОЦЫЯ КРАЯЗНАЎЧЫХ БІБЛІЯГРАФІЧНЫХ РЭСУРСАЎ У ІНТЭРНЭТ-АСЯРОДДЗІ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Прамоцыя краязнаўчых бібліяграфічных рэсурсаў (КБР) вядзецца абласнымі бібліятэкамі з выкарыстаннем разнастайных сродкаў сацыяльнай камунікацыі ў інтэрнэт-асяроддзі. Найбольш актыўна задзейнічаны сайты бібліятэк, сацыяльныя сеткі, відэахостынгі, менш блогі, Вікіпедыя і іншыя магчымыя формы прамоцыі праз інтэрнэт. Прамоцыя краязнаўчага сегмента бібліяграфічных рэсурсаў бібліятэк актуальна для інфармацыйнага забеспячэння вучэбных дысцыплін краязнаўства на розных ступенях сістэмы адукацыі; кіраўнікоў і спецыялістаў сістэмы дзяржаўнага кіравання і структур эканомікі рэгіёна; папулярызацыі краязнаўчых ведаў сярод насельніцтва рэгіёна і ў глабальным маштабе.

Галоўную ролю ў прамоцыі КБР адыгрывае сайт бібліятэкі. Аптымальна прадстаўляць на сайце краязнаўчы раздзел, праз які раскрываюцца краязнаўчыя інфармацыйныя рэсурсы (КІР) бібліятэкі і знешнія даступныя рэсурсы. У многіх універсальных навуковых бібліятэках свету створаны самастойныя краязнаўчыя сайты і парталы. У абласных бібліятэках Беларусі краязнаўчы раздзел ёсць на сайтах Брэсцкай, Мінскай, Гродзенскай, але адсутнічае на сайтах Віцебскай, Гомельскай і Магілёўскай АБ. Праз раздзел «Краязнаўства» на сайтах Брэсцкай АБ і Гродзенскай АНБ зарэгістраваны карыстальнік атрым-

лівае доступ да буйных КБР. Але ў гэтых раздзелах сканцэнтравана толькі частка КІР, шэраг рэсурсаў адлюстраваны ў раздзелах «Нашы выданні», «Рэсурсы», «Праекты». Спасылак паміж КІР няма.

Для спажыўцоў, якія задзейнічаны ў адукацыйным працэсе, бібліяграфічныя БД «Краязнаўства», бягучыя ўніверсальныя паказальнікі, календары знамянальных і памятных дат з'яўляюцца асноўнымі інфармацыйнымі крыніцамі па ўсіх галінах дысцыплінарнага комплексу краязнаўства. Бібліяграфічныя БД «Краязнаўства», рэалізаваныя ў межах электронных каталогаў ALIS-web, прадстаўляюць інструментарый пошуку, уласцівы гэтай сістэме, інтэрфэйсы стандартызаваныя. Такой БД няма ў ЭК Гомельскай АУБ, што ўскладняе пошук краязнаўчых матэрыялаў. Прамоцыя гэтых рэсурсаў на сучасным этапе выклікае пэўныя пытанні:

1) недастатковая індэксацыя дакументаў, што вядзе да прабелаў у пошуку інфармацыі аб пэўных тэрытарыяльных аб'ектах, асобах, падзеях;

2) раздзельнае прадстаўленне артыкулаў і краязнаўчых кніг. Карыстальнік у БД «Краязнаўчая літаратура» атрымлівае толькі спісы артыкулаў, а ў БД кніг – звесткі аб краязнаўчых кнігах. Гэта праблема для карыстальніка, тым больш што даведка да электроннага каталога не змяшчае тлумачэнняў па гэтым пытанні;

3) размяшчэнне ў інтэрнэце не прыводзіць да даступнасці бібліяграфічных запісаў з электронных каталогаў АБ для карыстальнікаў. Знаходзяцца на першых старонках бібліяграфічныя запісы ОЗОН, аўкцыёнаў, РНТБ, з Летапісу друку, бібліятэк універсітэтаў (ІРБІС) і бюлетэняў новых паступленняў гэтых бібліятэк, але не з ЭК абласных бібліятэк. Таму існуюць пэўныя праблемы з прамоцыяй галоўных універсальных бібліяграфічных КІР у інтэрнэце. У Google ідэксуюцца некаторыя краязнаўчыя БД Віцебскай АБ, напрыклад, «Художники Витебщины»;

4) каталогі мясцовых выданняў як асобны бібліяграфічны рэсурс у інтэрнэце айчыннымі АУБ практычна не выведзены, у гэтым істотная розніца ў параўнанні з расійскімі абласнымі бібліятэкамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Выданне бягучых ўніверсальных бібліяграфічных паказальнікаў літаратуры аб вобласці амаль прыпынена ў АУБ, акрамя Гомельскай АУБ, якая рыхтуе штогоднік «Гомельшчына ў друку». Лічыцца, што ўсё новае магчыма знайсці ў электронных каталогах. Гэта праблематычна. Па-першае, бягучыя паказальнікі ўтрымліваюць экспертна ацэненыя публікацыі і структураваныя масівы краязнаўчай БІ, чаго карыстальнік не ўбачыць у ЭК. Па-другое, гэтыя паказальнікі выпускаліся некалькі дзесяткаў гадоў і з'яўляюцца ў сукупнасці буйным упарадкаваным бібліяграфічным рэсурсам. АУБ мэтазгодна алічбаваць усе выпускі паказальнікаў і прадставіць у электронных архівах і электронных бібліятэках. Калекцыя гэтых паказальнікаў можа стаць падставай для стварэння цікавых сучасных інфармацыйных прадуктаў, якія пакажуць старонкі мінулага ў жыцці рэгіёнаў. Спадарожна адзначым, што некаторыя расійскія АУБ, якія прыпынілі выпуск АУБ, узнаўляюць гэтыя выданні [2].

Календары знамянальных і памятных дат кумулююць важныя падзеі, фактаграфічныя і бібліяграфічныя даныя. Тэндэнцыя архівіравання папярэдніх выпускаў календароў існуе, і важна сабраць калекцыю, даступную ў адным месцы. Гэта рэалізавала Брэсцкая АБ, яе каляндар знамянальных і памятных дат даступны карыстальнікам у выглядзе лічбавых копій, пачынаючы з 2010 г. (у гэтым календары краязнаўчыя даты складаюць адзін з раздзелаў). У раздзеле выданняў календары адлюстроўваюць Гомельская, Магілёўская і Віцебская АБ і размяшчаюць бібліяграфічныя запісы на іх па гадах разам з іншымі выданнямі бібліятэкі, але Гомельская і Магілёўская, Гродзенская АБ змяшчаюць толькі бібліяграфічныя запісы аб іх выхадзе. У аддаленым доступе карыстальнікі могуць працаваць з календарамі Брэсцкай, Віцебскай і Гродзенскай АБ, Мінская АБ не выпускае календары. Заслугоўвае вырашэння задача алічбоўкі календароў за увесь час іх выпуску і забеспячэнне даступнасці гэтых калекцый для знешніх карыстальнікаў. Календары на новы год, выдадзеныя ў малой колькасці экзэмпляраў, большасцю беларускіх АУБ прызначаюцца на продаж і не даступны як лічбавыя копіі ці версіі.

Для АУБ актуальная задача алічбоўкі рэдкіх каштоўных дакументаў, мясцовых перыядычных выданняў, фотадакументаў,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

якія важныя для вывучэння мясцовай гісторыі і лёсаў мясцовага насельніцтва. Вырашэнне праблемы звязваецца са стварэннем краязнаўчых электронных бібліятэк ці адпаведных раздзелаў у электронных бібліятэках. У гэтым кірунку працуюць Гродзенская АНБ, у электроннай бібліятэцы якой прадстаўлены электронная калекцыя «Гродзеншчына ў XIX – пач. XX ст.» – лічбаваныя копіі рэдкіх выданняў на польскай і рускай мовах і БД «Гісторыка-культурныя каштоўнасці Прынёманскага краю». Праект электроннага рэпазіторыя краязнаўчых дакументаў «Библиотека доступная всем» абгрунтаваны Магілёўскай АБ. Мэта праекта – захаванне фонду рэдкіх дакументаў і мясцовых газет.

Пакуль што для карыстальнікаў часцей даступныя лічбавыя копіі асобных краязнаўчых выданняў з фондаў бібліятэк і БД поўнатэкставых дакументаў. Напрыклад, Гродзенская АНБ адкрыла доступ да ІР «Гродна на старонках “Гродзенскай праўды”» – артыкулаў, якія асвятляюць развіццё горада ў перыяд 1945–2001 гг. Электронная бібліяграфічная калекцыя Віцебскай АБ «Витебщина: документальное наследие» мае крыніцазнаўчае значэнне для вывучэння гісторыі края, але поўнатэкставы доступ магчымы ў бібліятэцы.

Прамоцыя КІР абласных бібліятэк у Вікіпедыі не вызначаецца актыўнасцю. Пакуль няма звестак пра Брэсцкую, Віцебскую Гродзенскую і Магілёўскую АБ. У артыкуле аб Гомельскай АУБ адзначаны час стварэння аддзела краязнаўства, профіль яго работы. Спасылкі да артыкула дадзены на КІР бібліятэкі, у т. л. паўнатэкставую БД «ГОУБ в прессе», віртуальныя музеі землякоў – славутых беларускіх пісьменнікаў. Улічваючы вопыт многіх універсальных бібліятэк, бібліятэкарам-краязнаўцам пажадана ўзмацняць сувязі паміж Вікіпедыяй і КІР. Гэта неабходна для таго, каб паказаць наяўнасць унікальных ІР пра асобныя тэрыторыі, іх культурны і эканамічны патэнцыял. Вядома, што ў пошуках звестак аб асобе, геаграфічным аб’екце і інш., карыстальнік хутчэй звяртаецца да пошукавых сістэм, а не да сайта абласной бібліятэкі. Пошукавая сістэма ў ліку першых выдае спасылкі да Вікіпедыі. Таму бібліятэкам мэтазгодна актыўней удзельнічаць у Вікіпедыі і аснашчаць артыкулы, прысвечаныя рэгіёнам, дакладнымі, экс-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пертна ацэненымі спасылкамі на КІР. Гэты напрамак выбраны многімі замежнымі бібліятэкамі [1].

Практычна не атрымалі развіцця, як канал прамоцыі краязнаўчых бібліяграфічных рэсурсаў АУБ, іх нешматлікія блогі.

Сярод сацыяльных сетак бібліятэкі аддаюць перавагу «Вконтакте», «Facebook», менш «Одноклассники» ці інш. Найбольш адлюстроўваюцца падрыхтаваныя мерапрыемствы. Так, «Вконтакте» бібліяграфічны аспект прасочваецца, напрыклад, у паведамленнях аб фотавыставе «Гродна ў гады Вялікай Айчыннай вайны», аб падрыхтоўцы календара на 2020 г., відэааглядзе тэматычных выстаў, у рэкамендацыях пачытаць новыя краязнаўчыя кнігі.

Важным каналам для бібліятэк стаў YouTube. У відэахостынгу выкладваюцца відэафільмы, рэпартажы, сюжэты рэгіянальных і нацыянальных каналаў тэлебачання, відэаэкскурсіі па бібліятэках. Выступленні кіраўнікоў і спецыялістаў АУБ, журналістаў, а таксама удзельнікаў бібліятэчных мерапрыемстваў знаёмяць з падзеямі па напрамку краязнаўчай дзейнасці. Звестак пра бібліяграфічныя факты няшмат. Напрыклад, у справаздачным відэафільме Магілёўскай АБ за 2015 г. узгадана прэзентацыя біябібліяграфічнага паказальніка «Как вечны Симоновские строки…», прысвечанага пісьменніку К. Сіманаву, яго галоўны твор «Жывыя і мёртвыя» напісаны пад уплывам падзей на Буйнічскім полі ў пачатку Вялікай Айчыннай вайны, фактаграфічнай БД «Таленты ад роднай зямлі». Віцебская АБ прадставіла інфармацыю аб адкрыцці адноўленага аддзела краязнаўчай літаратуры і бібліяграфіі да свайго 90-гадовага юбілею ў лістападзе 2019 г.

Трэба канстатаваць, што інтэрнэт і сацыяльныя сеткі адкрылі для бібліятэк новыя шляхі прамоцыі краязнаўчых бібліяграфічных рэсурсаў. Разам з прамым доступам да іх (БД «Краязнаўства», бібліяграфічныя дапаможнікі) як прыярытэтны кірунак неабходна разглядаць бібліяграфічнае аснашчэнне іншай краязнаўчай інфармацыйнай прадукцыі бібліятэк, якое пашырае і ўзбагачае кожны інфармацыйны аб’ект.

---

1. *Мартиросова, М. Б.* Библиотеки и Википедия [Электронный ресурс] / М. Б. Мартиросова // Современная краеведческая деятельность библиотеки в цифровом формате : материалы межрег. науч.-практ. конф., Челябинск, 25 сент. 2015 г. – Режим доступа: http://chelreglib.ru/

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

media/files/resources/editions/ sovremennya_ kraevedcheskaya_deyatelnost.pdf. – Дата доступа: 4.10.2019.

2. *Трубина, Е. И.* Универсальная краеведческая библиография: мы ее теряем? [Электронный ресурс] / Е. И. Трубина // Проблемы краеведческой деятельности библиотек : Всероссийский семинар, 24–27 сент. 2019 г., Чебоксары. – Режим доступа: https://www.youtube.com/watch?v=d5ig0rr2GC8. – Дата доступа: 30.10.2019.

***Н. М. Свергунова,***
*кандидат педагогических наук,*
*начальник отдела аспирантуры и магистратуры*
*федерального государственного бюджетного*
*образовательного учреждения высшего образования*
*«Орловский государственный институт культуры»*

# КУЛЬТУРНО-ПРОСВЕТИТЕЛЬСКИЕ БИБЛИОТЕЧНЫЕ ПРОЕКТЫ В КОНТЕКСТЕ ЭЛЕКТРОННОЙ КОММУНИКАЦИИ

Под воздействием происходящих глобальных изменений постепенно трансформируется современная библиотека: модифицируются технологии сбора, обработки, хранения и предоставления информационных ресурсов, система обслуживания пользователей, видоизменяются библиотечные пространства, повышаются требования к библиотечному персоналу. Неизменной остается сущностная документно-коммуникационная функция библиотек, обеспечивающая взаимосвязь между документом и читателем. При этом информация, предоставляемая библиотекой, должна быть достоверной, безопасной для отдельного пользователя и общества в целом, иметь конструктивный характер, содействовать формированию лучших человеческих качеств и гуманистических ценностей. С целью доведения до пользователя достижений человечества, зафиксированных в документных источниках, библиотеки используют различные формы работы.

В современных условиях, когда окружающее человека информационное пространство наполнено деструктивными, ложными, носящими явный разрушительный характер сведениями, особую значимость приобретает культурно-просветительская деятельность библиотеки. Веяния современности, повсемест-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ